3. Ой, як не хочацца расставацца *(П. Рунец.)* 4. Дык няхай завеі нам лыжню навеюць *(М. Сазончык.)* 5. Гэй, памочнікі, пара абедаць *(П. Рунец.)*

Спішыце, пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце словы, з якіх пачынаюцца клічныя сказы.

## Галоўныя і даданыя члены сказа

### Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа

**112.** Спішыце, дапаўняючы сказы ў тэксце патрэбнымі словамі.

... зацягнулі ўсё неба. Падзьмуў халодны ... . Заблішчалі яркія ... . Грымнуў ... . На зямлю паліў ... .

... схаваліся пад лісце. ... сцішыліся ў гнёздах.

Словы для даведкі: *жучкі, хмары, птушкі, вецер, дождж, маланкі, гром.*

Якую назву можна даць тэксту?

Пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной лініяй.

Слова, якое абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, — гэта **дзейнік**. Дзейнік адказвае на пытанні х т о? ш т о?



Правообладатель Национальный институт образования

**113.** З асобных слоў складзіце і запішыце прыказку. Чаму так гавораць?

Курачка, зярнятку, па, збірае, бывае, сытая, і.

Знайдзіце ў сказе і падкрэсліце адной лініяй дзейнік.

Дзейнік у сказе падкрэсліваецца адной лініяй: *З-за хмар выглянула* (ш т о?) *сонейка*.

**114.** Дапоўніце скорагаворкі патрэбнымі словамі. Назавіце ў кожным сказе дзейнік.

Гучна г**а**г**а**талі [г..] г**а**м**а**нлівыя.
В**о**ўкам вые [в..] ув**о**сень. *(У. Мацвеенка.)*

Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць скорагаворкі.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар. Запішыце па памяці адзін сказ на выбар.

**115.** Прачытайце сказы. Выпішыце тыя з іх, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца дзейнікамі.

1. У парку дзеці ўбачылі прыгожыя **дубы**. На палянцы раслі магутныя **дубы**. 2. **Дрэвы** шумелі ад ветру. Каля дома дзядуля пасадзіў розныя **дрэвы**. 3. На зямлю падалі спелыя **жалуды**. Аленка збірала **жалуды** для вавёрачкі.

Падкрэсліце ў запісаных сказах дзейнікі.



Правообладатель Национальный институт образования

**116.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі і запішыце. Падкрэсліце ў кожным сказе дзейнік.

1. З-пад травы ля самай сцежкі вызіраюць … . *(А. Зэкаў.)* 2. Галаўны́ шыкоўны ўбор дэманструе … . *(А. Зэкаў.)* 3. З-за бяроз, задраўшы шапкі, усміхаюцца … . *(А. Зэкаў.)* 4. Пад дубамі грыбнікі бралі ў кош … . *(У. Мацвеенка.)*

Словы для даведкі: *баравікі, абабкі, сыраежкі, мухамор.*

**117.** Спішыце, дапаўняючы сказы патрэбнымі словамі.

Самалёт … у небе. Карабель … па моры. Аўтамабіль … па шашы. Чалавек … па сцежцы. Конь … па дарозе. Заяц … па полі.

Словы для даведкі: *скача, бяжыць, ляціць, плыве, едзе, крочыць.*

Знайдзіце ў сказах дзейнікі і падкрэсліце іх адной лініяй. Што гаворыцца пра дзейнік у кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма лініямі.

Слова, якое абазначае, што гаворыцца пра дзейнік, — гэта **выказнік**. Выказнік адказвае на пытанні *што робіць? што рабіў? што будзе рабіць?* і інш.

Дзейнік і выказнік — **галоўныя члены сказа.**



Правообладатель Национальный институт образования

**118.** Дапоўніце сказы слоўнікавым словам у патрэбнай форме і запішыце іх. Падкрэсліце ў кожным сказе дзейнік адной лініяй, а выказнік — дзвюма.

Зоркі … на мароз.
Золата і ў смецці … .

**блішча́ць**

Які са сказаў з'яўляецца прыказкай, а які — народнай прыкметай? Растлумачце сэнс прыказкі.

> Выказнік у сказе падкрэсліваецца дзвюма лініямі: *Дзеці* (ш т о  р о б я ц ь?) *гуляюць на вуліцы.*

**119.** Прачытайце загадку-пытанне і адгадайце яе. Складзіце па пытанні апавядальны сказ, у якім дзейнікам будзе слова-адгадка.

Што вандруе ў канверце па ўсім свеце?




Запішыце сказ, падкрэсліце ў ім галоўныя члены.

**Рм** Разгледзьце паштоўкі. Якія сказы на іх запісаны? Перад якімі святамі дасылаюць кожную з гэтых паштовак?



Правообладатель Национальный институт образования

**120.** Прачытайце тэкст. Чым уразілі вас паводзіны звяркоў?

## Па арэхі

Была сярэдзіна верасня. Дзьмуў лёгкі ветрык. З алешніку за вёскай даносіўся гаркаваты пах прывялай травы. Шарахцелі лістотай каля возера ляшчы́ны. На бераг каціліся хвалі з белымі грабянямі.



Янка збіраў у ляшчынніку арэхі. Раптам хлопчык убачыў у возеры дзвюх вавёрак. Звяркі выставілі з вады мордачкі. Пушыстыя хвосцікі ўзвышаліся над вадой, нібы сцяжкі. Вавёркі рухаліся ў бок ляшчынніку.

Янка здагадаўся, што звяркі плывуць з процілеглага берага, з сасонніку, па арэхі. Каб не спалохаць іх, хлопчык схаваўся за кустамі. А вавёркі выбраліся з вады ды скокнулі на ляшчыну. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**ляшчы́на** — арэшына

Знайдзіце і прачытайце тую частку тэксту, у якой змешчана апісанне незвычайных паводзін вавёрак. Выпішыце з кожнага прачытанага сказа галоўныя члены.

Узор. *Янка збіраў.*

Рм Вусна перакажыце гэту частку тэксту з апорай на выпісаныя спалучэнні слоў.



Правообладатель Национальный институт образования

**121.** З прапанаваных частак складзіце прыказкі. Калі так гавораць?

| | |
|---|---|
| З малых крыніц | б**е**рагі падмывае. |
| Ціхая в**а**да | в**я**лікая р**а**ка нар**а**джаецца. |

Назавіце ў кожнай прыказцы галоўныя члены сказа. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

**122.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Падкрэсліце ў кожным сказе дзейнік і выказнік.

Б..розавы, асв..ціла, сонца, гай.
Купаюцца, дрэвы, промнях, сонечных, у.
Ветрык, лёгкі, пав..ва́е.
Шамацяць, лісточкі, залатыя, б..розах, на.

Растлумачце правапіс прапушчаных літар.

**123.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў. Запішыце тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме.

## Снег і апенькі

надоўга пасвятлела шэрае снежаньскае неба ўсталяваліся цёплыя сонечныя дзянькі згінулі маразы са стрэх закапалі буйныя кроплі ў лесе з’явіліся праталіны на пнях дружнымі сямейкамі выраслі апенькі *(Паводле Я. Галубовіча.)*

Падкрэсліце ў кожным сказе дзейнік і выказнік.



Правообладатель Национальный институт образования